БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя —зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаукай да д му у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 ру
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 12. Менск. Субота 6 красавіка 1918 г. Год I

Менск 6/IV.

«Земсаюз, Земгор. Земзем.

Менск у часе вайны зраўся нейкім тылавым «Харнам»· Тузэмцы прапалі, іх ожна было іш'чэ нідаўна у умах франтавых і тылавых юдзей, каторыя залівалі вуцы,, спаткаць так сама рэдз, як белую мыш.

Патрохі з закрыцціям фрону Менск пусьцеў. Гэтыя беыя мышы пайшлі гусьцей, ават яны расхрабрыліся і абілі дзьве контр-рэволюцыйыя атакі у архірэйскім доме, кідаючы адтуль на сходах ейкі большэвіцкі камісарылт.

Большэвікі, хацелі трымаць арку вялікай француcкай рэлюцыі і пробавалі «закрыць» элігію. У касьцёле і каля асьцелу рэволюцыйныя Данэны з латышоў, замест «падкуй» ад народу туземнаго—асталі, як кажуць дэмакраты, а «мордзе».

На радасьць старамінчукоўны ўжо перэсталі быць гасьэмі ў «Харбіне». Але цэлое лемя «харбінцоў» іш'чэ астаося: адны з іх галадаюць а ругіе ш'часьліўцы іш'чэ жуюць іргі...

Ахфіцэры і салдаты, катоых доля цяпер закінула ў Менск маюць ад усіх самыя рыхільныя адносіны. Яны адстаўлялі свой лоб над кулі, ны ні хваліліся. Страцілі нога з іх сваё здароўе, свае рыватныя заняцца, 4 годы як ыкінуты з жыцця. Сямейства х церпяць тут часамі голад. Ніхто ні скажыць проціў іх і лова. Тым больш, што значая часьць воіноў, каторыя тут сталіся з гэтых краёў.

Для каго доля ні мачыха, маці родная, дык гэта, як у нас кажуць для «самаабаронцаў». Сумленные франтавікі ыслужылі сабе голад, а самаабаронца—«ліквідацыю».

Беларусы дамагаліся на ўсіх з'ездах, каб дабро земскаго і гарадзкого саюзоў, было выкарыстано для зруйнованаго тутэйшаго краю. Гэты край пракарміў мільёны бежанцоў з іх сканінай у 1915 г. і адступаючую расійскую армію—карма. Нашэ багецце—лясы вайна злажыла ў пень. Прыфронтавая паласа увесь час дзеліцца скарынкай хлеба з вайскамі і гарадамі.

Маетнасць «земгора» цэніцца на соткі мільёнаў: лазарэты, павозкі, коні, заводы, пільні, агранамічные аддзелы, тысячы баракаў і інш. гэта ўсе лічыцца цяпер, як бы уласнасцью менскаго губэрнскаго земства і гораду Менска. Усе гэта прадаецца, «ліквідзіруецца» (ліквідатэр—п. Злобін) так, што па гораду ходзяць анэкдоты. Грошы ідуць на «самавыплату» пэнсій, заслужаных, бадай за працу на ліквідацыі... Тут можна напісаць цэлую «Земгусарыаду».

Афіцэрам так сама шмат нівыплачэны пэнсіі; а потым бедным бежанцам—ці выплаціпі пэнсію за іх хаты згарэлыя і трох-летнія мукі??

А тўт, каб дастаць грошы за «благоденственное житіе», людзі шахруюць і зьніштожваюць дабро нашэго краю.

І ўсё гэта пад штандарамі менскіх гарадзкой думы і земства. Трыумвірат пейкі:

«Земсаюз, Земгор, Земзем.»!

Пералом

Ідэя Устаноўчаго Сойму у Расіі памалу пачала траціць сваю павабнасьць.

Да большэвікоў, каторым Устаноўчы Сойм, у разе яго склікання, прыгражаў бы канцом іхняго панавання прылучаюцца цяпер людзі з саўсім іншых грамадскіх колаў. Надта паказнай у гэтым пытанню, служыць пазыцыя пр. П. Ноўгародцава, які у № 42 газ. «Русскія Вѣдомости» зьмесьціў артыкул пад назв. «Мечты и дѣйствительность въ вопросѣ объ Учредительномъ Собраніи».

Проф. П. Наўгародцаў кажа, што удача Устаноўчаго Сойму—справа рэдкая. Пачынаючы ад першаго Уст. Сойму Францыі у 1789—1791 г.г. і да нашых дзен нам ведама шмат збораў гэтаго гатунку, часамі яскравых і шмат абецаўшых, але ні многа такіх, што па праўдзі дасягнулі мэты замірэння і устройства дзержавы. Толькі два з іх былі больш скутэчнымі: гэта,—францускі 1871—1875 г. г. і бэльгійскі 1831 г.—як раз тыя, што здаваліся залішне памеркаванымі і цьвярозымі. Яны стварылі конституцыі, якія з нікаторымі зьменамі жывуць і да гэтых час. Для карыснай працы Устраноўч. Сойму патрэбны два варункі: здольнасьць усяго народу знайсьці нейкую сярэднюю лінію, адпаведную патрэбам і магчымасьціям жыцця,—першы, і другі,—каб поруч з Устаноўчым Соймам стаяла моцная дзержаўная ўлада, каторая магла-б падтрымоўваючы бароцючы Сойм, праводзіць у жыццё яго пастановы.

А істнаванне такіх варункаў, сьведчыць аб тым, што ужо перад склікіаннем констытуанты у дзержаві устанавілася пэўная роўновага, што у парідзе змоўклі вастрэйшыя звады, ёсьць нейкая згода.

Нічога гэтаго у Расіі цяпер німа і пры такіх варунках німа чаго спадзявацца на Устаноўчы Сойм. Найважнейшай задачай часу, стаячай перад Расіяй, з'яуляецца утварэнне моцнаго ураду, здольнаго зрабіцца асяродкам нацыянальнай еднасьці. Расія цяпер ледзьве дыхае і ледзьве жыве. Ей трэба ачуняць каб жыць, а потым ужо думаць аб тым, каб мець добрыя і абдуманыя законы для жыцця. Нацыянальная ўлада—вось першы камень у фундамэнт адбудовы Расіі.

—Думкі п. П. Ноўгародцэва, здаюцца нам паказнымі ні толькі для т. зв. «кадэтскіх» колаў, але і для шырэйшаго грамадзянства у Расіі, ні выключаючы нават часьці работнікаў і селян. Гэта пачатак праўдзівай рэакцыі да якой Расія ідзець шпарка і ніухільна. Як будзе зложана тая нацыянальная ўлада, аб якой пачынаюць маркоціцца у Расіі, —німа ведама, але нашэ ш'часьце, што мы у гэтым памагаць Расіі ні будзям. Перад намі свая мэта: утварэння *праудзівай нацыянальнай*, дэмократычнай і здольнай да творчасьці на карысьць народу Беларускай ўлады.

Хлеб.

Цэны на хлеб са слоу прыежджаючых у Менск такія:

Сычэўка (Смаленск.) 1 ф. — 4р.

Смаленск—2.20 к.

Жлобін—1 р.

Асіповічы — 60 к.

Рамны— 35 к.

У Менску да гэбрэйскіх сьвят цана трымалася 1 р. 20 к. —1 р. 50 к.; падчас сьвята паднялася да 2 р. 40 к. і даражэй.

У Сыбіры хлеба белага — пад дастаткам; 1 ф. масла— 3 р; шынкі 1 ф.—2 р. 50 к.

У селян Саратаўскай губ. запасы ёсьць па 2—3 тысячы пудоў; тое самае на Доне, Украіне.

Жалезныя дарогі растроіліся саўсім і свае работы не спаўняюць; банкі—большэвікі зьніштожылі, а банк—глаўны нэрв гандлю.

Апрача таго, земляробы ні маюць на што менять свой хлеб: карасіны, жалеза, тканіны і інш. рачэй, патрэбных ім,—німа, а зьбіраць «паперкі»—дакучыла. І так у народ паплыло ўжо мільярды «паперак.

У 1910 г. у Менск прыбывало хлебных прадуктаў 1 міл. 370 т. пудоў; с паміж іх пшаніцы—446 тыс. пуд. Менск, значыцца, з'едаў хлебных прадуктаў каля 4-х вагонаў у дзень.

Наш край ні прадаваў зерня, а карміў жывёлу. Мы прадавалі сала, каўбасы, масла, а за гэта куплялі з Украіны і Паволжа хлеб.

Уся Беларусь купляла са стараны каля 18 мільёнаў хлеба. Менская губ.—каля 7 міл. пудоў. Многа выціснуць хлеба з Меншчыны німа надзеі: шмат з'еў фронт і гарады, дзе народу стала ў двая. Мы—менчукі і цяпер кормімся хлебам земляробаў менскаго району.

Як толькі пазволяць нашым купцом паехаць на Украіну купляць і прывозіць вагоны 3—4 на дзень мукі, мы будзім мець хлеб па 40 к. і пачнем, быць можа, зноў прывыкаць да баранкаў і халаў.

Дарогі торговыя нашым хлебнікам усе добра знаны, як добра вядомы яны і харчовым управам.

М. К

На беларускім шляху.

Беларускае Народнае предстаўніцтво у Менску.

Заседанне 4 берэзьня 1918 р.

Сканструіраваны прэзыдіум прэдстауніцтва у складзе асоб:

Р. Скірмунт—старшыня.

А. Уласоу—віцэ-старшыня.

П. Алексюк—сяба прэзыдіума.

Пасьля дакладау сябра, камітэту Гадыцкаго-Цьвірко, Алеклюка і кс. Годлеускаго выпрацавана і зацьверджэна праграма конфэрэнцыі беларускіх арганізацый 25 берэзьня. На конфэрэнцыі маюць быць прачытаны ніжэй паданыя даклады. каторыя і лягуць у аснову яе працы:

I. Нацыянальна-культурныя задання—
дакладчык **Р. Скірмунт.**

II. Арганізацыя прасьветы—
кс Гадлеускі

III. Эканамічнае адбудаванне краю—
А. Уласоу.

IV. Арганізацыя беларускаго прэдстауніцтва—
П. Алексюк

Апрацаваныя тэзісы дакладау маюць быць прэдстаулены на разгляд і зацьверджэнне камітэту.

Праграмму работ конфэрэнцыі пастаноулена перадаць нямецкім уладам,

Дзеля арганізацыі шырока прэдстауніцтва звернуцца да акупацыйных уладау выдаць дазвол некаторым сябром камітэту прэдстауніцтва на праезд на месцы у Віленшчыну і Меншчыну, а також выклікаць прэдстаунікау з мест паказанных камітэтам па телеграфу.

Еднагалосьне пацьверджана право учасьця на конфэрэнцыі прэдстауніцтва толькі арганізацый раздзеляюшчых палітычную декларацыю ад 26 сакавіка г. р. (Беларускі Шлях № 3).

Дзеля наладжэння зносін і культурна нацыянальна беларускай працы у Магілеушчыні выбрана дэлегацыя у складзе сябрау: П. Алексюка, кс Гадлеускаго і А. Уласова.

Делегацыі даручэна увайсьці у кантакт з акупацыйнай

уладай і выясніць усе стараны беларускага жыцця на гэтай тэрыторыі.

Пасьля дакладау п.п. Левіцкаго і Уласава даручэна прэзыдыуму вайсьці негайно з просьбай да Германскіх Уладау аб дазволе перэнесьці у Менск беларускі вычыцельскі інстытут, каторы цяпер знаходзіцца у Яраслаулю, а такжа у Маладэчно старую беларускую сэмінарыю, што цяпер у Смаленску.

У запісцэ, каторую маець з гэтаго поваду злажыць прэзыдіум предстауніцтва уладам выясьніць усе значэнне гэтых культурных установау для нацыянальнай прасьветы у Беларусі, а також юрыдычныя правы беларусау на уладанне імі. Побач з гэтым прыняць усе меры каб расейскі урад ні перешкодзіу перэезду гэтых вучальняу у бацькаушчыну.

Пасьля даклада сябра П Алексюка аб мэтах найбліжшай працы прэдстауніцтва пастаноулена: прыняць усе высілкі да утварэння у як найбліжшым часе беларускіх пачатковых школ, прытулка для дзяцей і выдання школьных падручнікау.

З прычыны патрэбы на заклад усіх гэтых установау коштау створэна спэцыяльная камісія, каторая маець выпрацаваць плян дабыцця грашэй толькі на культурна-прасветныя мэты

У склад Камісыі вайшлі: сябры прэдстауніцтва: Годыцкі Цьвірко, П. Алексюк, Р Земкевіч і палкоунік Беніхсан.

Маючы на увазе выясьніушуюся з дакладау прысутных на заседані прэдстаунікау жэлезніцы, бежанцоу, беларускаго афіцэрства, а також Радашковічскаго района, неасьведамленасьць нікаторых грамадзкіх кругоу аб заданнях народнаго предстауніцтва—пастаноулена выдаць и пашырыць декляpацыю ад 26 сакавіка г. р., а також вясьці болей шырокая асьведамленне усей прэсы аб заданнях і работах.

З Румынскаго фронту.

У Менск прыехалі беларускіе прэдстаўнікі з Румынскаго фронту; камісар Манцэвіч і заведуючы вайскавой часьцю камісарыяту гэнер. штабу падпалкаўнік Біттэнбіндэр.

На Румынскім фронце беларусы мелі: армейскі корпус, каторы за нехватом людзей быў сфармованы у беларускую дывізію [начальнікам дывізіі — ген. Любімаў], дзьве апалчэнскія дружыны (Магілёўская і Вітэбская), Беларускі кавалерыйскі нацыянальны гусарскі полк, артылерыйскую брыгаду і шмат тэхнічных часьцей.

С прычыны міру Румыніі з Гэрманіей—усе беларускія вайсковыя часьці, як гэта запатрэбовала Гэрманія, былі дэмабілізаваны, салдаты—распушчаны, а дастатак і аружжэ—здадзено на схоў у армейскіе склады.

Агульныя весткі.

Дэсант нямецкаго войска у палудзеннай Фінляндзіі.

Урадова праз Бюро Вольфа.

БЭРЛІН 3 красавіка. Часьці нашых ваенных марскіх сілаў высадзілі сягоння рано, пасля цяжкаго пераходу праз лёдавыя і мінаваныя паля, назначанае для помачы Фінляндзіі войско у Гангоэ (Палудз. Фінляндзія).

Шэф штабу адміралтэйства.

БЭРЛІН 2 г. м. Жал.-дар. станцыі у Компьене і Суассоне і сховы у гэтых ваколіцах былі з усьпехам закіданы бомбамі. Станцыя ж. д. у Компьене і лінія Клермонт-Амьен знайходзяцца пад ніупынных агнём нямецкай дальнябойнай артылерыі.

ЦЮРЫХ 2 г. м. Даносяць с Парыжу, што дзержавы коаліцыі выставілі на фронт больш 70 рэзэрвовых дывізыяў, за помаччу каторых спадзяюцца перахіліць на свой бок удачу. Амьен можа быть іпчэ раз будзе адступлены, але Компьен мусіць быць утрыманы, чаго-б гэта ні каштавала.

ЦЮРЫХ 2 г. м. Сюды даносяць, што з Італіі на заходні фронт пасьпешна перасылаюцца новыя узмацавання.

БЭРН 3 г. м. 28/III амэрыканскі сэкрэтар вайсковых справаў Бэкэр выехаў з Францыі у Італію.

ПАРЫЖ 3 г. м. Сягоння прадаўжаўся абстрэл Парыжу з дальнабойнай гарматыс «Sesoo» даносіць, што абстрэл Парыжу з далёкай дыстанцыі ўзмацніўся. Стрэлы зрабіліся часьцейшымі.—с прамяжуткамі ад 4—8 мініт, што наводзюць на думку аб істнаванню несколькіх гарматаў. У нядзелю на Элізэйскіх палех знайшлі кавалкі нямецкіх гранатаў.

Сяголетні красавік.

Дауно вясна, а сьнег на полі,
— Пад ім зачауся красавік—
Хоць ні было іпчэ ніколі,
Каб гэтак доўга сьнег ні зьнік,
І слонцэ рэдка так сьмяецца,
І холад днём іпчэ ў цяні,
І лед іпчэ ні падаецца,
Мейсцамі нават зні-ні.
Ні можа быць! Ні пратрывае
Так доўга холад зімавы,
Каб аж да Юр'я, аж да маю
Ні паказалося травы.
Настане час, і лёд скранецца,
І сьнег абернецца вадой,
Зіма далёка апынецца
З марозам, сьнегам і нудой.

Захар Вехаць.

3/IV 18 р.
Менск.

Весткі з Расіі.

«Лена» нацыяналізуецца.

У Ленскім прыісковым районе устанавілася улада саветау. Усе прыіскі а у той лічбе і амэрыканскай компаніі Міллер нацыяналізуюцца. Харчовыя справы, пярэданы харчова-гандлеваму аддзелу савета.

Ленскі район—агульная назва усіх прыіскоу у даунейшым Віцімскім горным округу. Апрача буйнейшай золатапрамысловай кампаніі Міллер і шчуплай лічбы дробных прамыслоуцау, тут істнуе найвялікшая у Расіі акцыонэрная кампанія «Ленское золото-промышленное товарищество», каторая у часе вайны адна давала да 1000 пуд. золата у год. У справах компаніі праз ангельскую фінансовую арганізацыю *вялікімі фундушами* заінтэрэсованы ангельскія капіталісты,—«Лена-Гольдфільд» Пытанне аб нацыяналізацыі прыіскоу паднімалося тут с пачатку рэволюцыі, але адсоувалося умеркаванымі элемэнтамі,—цяпер, відаць, хваля соцыялізацыі дакацілася і сюды.

Кольні каштуе мір з Нямечынай.

Я. Пілецкі у «Новой Жизні» падрахоувае тымчасовыя страты Расіі. Пад увагу узяты: «9 польскіх губ. Холмшчына, 3 Балтыцкіх губ., 3 Літоускіх (?), Кацярынослауская Кіеуская, Валынская, Падольская, Чарнігоуская, Палтауская і Херсонская—украінскія — Бессарабская губ., Батумская обл. і часьць Карскай». Іншыя губ.; Менская, Віцебская, Харкауская і г. д. у падрахуднак ні улучаны. Лічбы такія:

Абшар 707 т. кв. в. . . .	4%
Жыхароу 46 мільенау душ	26%
Засевау 28 мільен. дзес.	27 »
Ураджай 2900 мільен пуд.	37 »
Жал. дарогі 17500 м. вер.	26 »
Фабр.-заводск. прам. 925 мільен. рубл.	33 »
Мэханічн. цягнікоу 575 тыс. сіл	39 »
Вугаль 1500 мільен. пуд.	75 «
Чугун 190 мільен. пуд. .	73 »

Фінляндзія ні узята у гэты падрахунак, бо яна „і раней была самаістнай экономічнай адзінкаю, адзеленай ад Расіі мытнай сьцяною“.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

У камісіі народнай прасьветы Мінскай Гарадзкой Думы 3-го красавіка 3-і раз разглядалася справа аб курсах беларусазнауства. Ні гледзючы на тое, што кожны раз камісія прызнавала гэтые курсы вельмі карыснымі і патрэбнымі, праз Думу яны ні прайшлі, бо як тлумачыу старшыня камісіі, цяпер усе асігноукі павінны праходзіць праз фінансовую камісію, а яна цяперь занятая выпускам бонау і ні мае часу разглядзець асыгнаванне на курсы беларусазнауства.

Ассыгнавання прайдуць разам з агульнай сметай, а тым часам гэтые курсы прырауняны да курсау вячорных для дарослых і як такіе будуць даставаць по 200 рублеу у месяц

Апроч таго разглядалася смета гарадзкая па Адзелу Прасьветы. Устаноулены мейсцы 4 інструкторау, каторые будуць атрымоуваць па 500 р. у месяц, а 4 сэкрэтары, каторые павінны напрауляць працу інструктароу па нацыяналізацыі школы, толькі па 300 рубл.

Загадчык гаспадаркі дастане 450 р. м. Будзе апрача таго асобны сэкрэтар камісіі с пэнсіяй 300 рублеу Затым прынята смета на народные дамы, на пляцы для дзяцінных гульняу, музэй, бібліатэкі, клюбы і т. д.

Справа ставіцца шырока. Чы хваце толькі грошэй?

Псаломшчык пярэспінскай царквы Тераускі завеу брыдкі звычай браць плату за просфары па 65 кап. за штуку. Гэткай моды дагэтуль ні чутно было ішчэ, тым больш ні павінна яна быць у царкве пры могілках, дзе так патрэбны просфары для веруючых.

Паміж зямляуласьнікау нашай губэрні, якіе пауцекалі ад большэвіцкіх парадкау у наша места, пачауся вялікі рух—сталі варочацца у свае двары. Селяне пачалі варочаць дворнае дабро, якое папало у іх рукі іншым разам проці іх волі—па прыказу большэвіцкіх камітэтау.

Усе перашкоды да выезду, якія дагэтуль спатыкаліся, будуць нямецкім начальствам гэтымі днямі адменяны

Жалезно-дарожныя весткі. Гэтымі днямі чакаюць прыезду з Украіны прэдседацеля цэнтральнаго камітэту служачых Л.-Р. ж. д. Россето, начальніка руху—Крыжонаускаго і інш., куды яны ездзілі у справе далучэння Л.-Р. ж. д. ад Крэменчуга да Брэсту—З Гомялям да украінской дарожнай сеткі. Праекты гэтые вельмі ніпэуные, бо глауны вучастак цяпер у руках немцау.

Так сама ніпэуны ішчэ праект і упраулення палескіх ж. д. аб далучэнні да сваей сеткі вучастка Гомяль-Рамны.

Праект сярэдняй тэхнічнай школы і кошт яе, апрацованы саюзом інжэнерау і тэхнікау, прэдстаулены будзе 17-го красавіка Губэрнскаму Земству.

Павэдлуг праекту школа будзе мець тры адзелы:

1) Гаспадарскаго (заведуючы—інж. Дубах;

2) мэханічнаго (зав. інж. Іонін);

3) будоуляны (зав. інж Дубах)

У Пушкінскай бібліатэцы маняцца заняць пад склад кніжэк адзіі с пакояу, займаны цяпер чытачамы. Гэта вымагаецца вялікім наплывам чытачоу і цеснатой зложаных кніг, каторых трудна хутка адшуківаць.

Кошт пераробкі абайдзецца бібліатэцы 800 рубл.

Упрауленням Л. Р. ж. д. пасылаецца памоцнік начальніка службы руху інж. Сонцэу у Маскву да народных камісарау, каб выясьніць справу аб долі самога упраулення і яго служачых.

Рээміграцыйная сэкцыя пры Варшаускім міністэрстві унутрэнных справ прыймае прашэнні аб звароце бежанцоу з Менска, Рэвялю і Дзвінску.

Сэкцыя гэтымі днямі прыедзе у Менск с князям Сапегай на чале дзеля перегаворау у гэтай справе з нямецкім тутэйшым начальствам.

Гэтымі днямі некаторым жыхаром Варшавы дазволена будзе выехаць у родны край пасьля 3-х дзеннаго каранціну.

Рэдактар **А. Прушынскі.**
Выдавецтво **Т-во «Заранка».**

Друкарня Я. А. Грыньблята